ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
6
СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 34 (1447)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

## ТЭЛЕТАЙП

· Учора · Сёння · Заўтра ·

### АДБЫЎСЯ

пленум камітэта камсамола універсітэта, на якім разгледжаны арганізацыйныя пытанні.

А. АНАТОЛЬЕВА.

### У 66-Й ГАДАВІНЕ

утварэння Кампартыі Грэцыі быў прысвечаны ўрачысты вечар замежных студэнтаў, які прайшоў у БДУ. Разам з намі адсвяткаваць гэту памятную дату прыйшлі навучэнцы з Балгарыі, ГДР, ДРА, Палесціны, Кіпра, што вучацца ў Мінску, а таксама савецкія студэнты.

На вечары выступіў Герой Савецкага Саюза прафесар Д. П. Жмуроўскі.

Ніколас БАРДУНІАС (Грэцыя), студэнт факультэта журналістыкі.

### КАРЫСНАЯ РАЗМОВА

адбылася на юрыдычным факультэце. У госці да прафесарска-выкладчыцкага калектыву прыйшоў старшыня Вярхоўнага суда Беларускай ССР А. А. Здановіч. Ён пазнаёміў прысутных з вынікамі нядаўняга пленума Вярхоўнага суда рэспублікі, спыніўся на актуальных праблемах барацьбы з правапарушэннямі, што стаяць перад судовымі і іншымі праваахоўнымі органамі БССР.

Старшыня Вярхоўнага суда прывёў шэраг лічбаў і фактаў, якія характарызуюць сённяшні стан спраў у гэтай галіне. У канцы сустрэчы А. А. Здановіч адказаў на пытанні выкладчыкаў.

М. ЧУДАКОЎ, дацэнт юрыдычнага факультэта.

### СВОЕАСАБЛІВАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

клуба «Дружба» адбылося на факультэце журналістыкі. Яго ўдзельнікі — савецкія студэнты 2 курса, якія вывучаюць англійскую мову, і студэнты з афрыканскай краіны Уганда — падрыхтаваліся да завочнага падарожжа «СССР — Уганда».

Цікава расказалі пра сваю краіну нашы замежныя сябры. Пасля таго, як удзельнікі клуба прагледзелі здымкі і кнігі аб Угандзе, гэта афрыканская краіна не здалася ім ужо такой далёкай і незнаёмай. А расказ Франсіса Ачыра Амара дапоўніў нашы веды і ўяўленні пра мінулае Уганды, пра культуру гэтай краіны, пра народныя звычаі.

Наперадзе ў клуба «Дружба» новыя сустрэчы і знаёмствы.

І. КАЖЭЎНІКАВА, студэнтка факультэта журналістыкі.

● СТУДЭНТ І НАВУКА ●



# З ЭВМ НА «ТЫ»

У ЛІСТАПАДЗЕ на факультэце прыкладной матэматыкі праводзіўся заключны III тур Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» па праграміраванню і ЭВМ.

**— Вось ужо трэці раз прымаем мы гасцей з усёй краіны,— гаворыць намеснік дэкана ФПМ Анатоль Васільевіч Самусенка.— Алімпіяда — сапраўднае свята лепшых студэнтаў-праграмістаў малодшых курсаў. Здаровы дух спаборніцтва, вострае жаданне перамагчы — вось што заўсёды вызначае нашы сустрэчы, якія ўмацоўваюць сапраўды сяброўскія творчыя сувязі паміж ВНУ краіны.**

Роля ЭВМ у нашым жыцці пастаянна ўзрастае. Выкарыстанне яе даволі рознабаковае, як і сувязі, што аб'ядноўваюць яе з іншымі галінамі. ЭВМ служыць многім навукам. Шырокае і кола пытанняў, якія можа вырашаць машына. Таму зараз у Мінск прыехалі студэнты універсітэтаў і эканамічных інстытутаў, а ў Куйбышаве спаборнічаюць студэнты з тэхнічных і сельскагаспадарчых ВНУ.

Сёння студэнт — заўтра спецыяліст. Прафесія і час патрабуюць ад яго умення, вялікіх практычных навыкаў. Таму і пашыраецца выкарыстанне ЭВМ у вучэбным працэсе. Алімпіяда — вялікая дапамога, урок і для студэнтаў, і для выкладчыкаў. Нездарма, ацэньваючы вынікі алімпіяд 1982—1983 гг., калегія МінВНУ СССР адзначыла, што іх правядзенне садзейнічае развіццю ў студэнтаў навыкаў самастойнай работы, глыбокаму авалоданню ведамі, павышэнню ўзроўню выкладання.

Цікавыя і некаторыя факты з гісторыі алімпіяд: 1982 г.— удзельнічае 8 каманд-пераможцаў II тура (рэспубліканскіх спаборніцтваў); першае месца заваёўвае каманда БССР (і ў асабістым, і ў камандным заліку); 1983 г.— у барацьбу ўступаюць ужо 12 каманд. Перамагаюць масквічы, каманда БССР — на III месцы.

Алімпіяда — гэта не толькі лічбы, але і шматлікія арганізацыйныя пытанні, і культурная праграма. І тут усё бярэ на сябе камітэт камсамола, які правёў значную падрыхтоўчую работу. Вось што расказала сакратар камітэта камсамола ФПМ Л. Панчанка:

**— У час алімпіяды ў камітэта камсамола шмат клопатаў: патрэбна сустрэць гасцей, прыняць, як належыць, уладкаваць у інтэрнаты. Акрамя гэтага, мы падрыхтавалі вялікую культурную праграму знаёмства з універсітэтам, з горадам, наведванне музеяў, вечароў, дыскатэк.**

...І вось наступіў урачысты момант: адкрываецца III тур Усесаюзнай алімпіяды — тур, які выявіць самых моцных. Гучаць шматлікія віншаванні. Да студэнтаў звяртаюцца начальнік упраўлення ВНУ Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР У. Ц. Воднеў, члены арганізацыйнага камітэта і журы, выкладчыкі.

Гэта прадметная алімпіяда — не проста спаборніцтва ва ўменні карыстацца ЭВМ. Любая алімпіяда — гэта магутны стымул для развіцця творчых сіл, для росту спецыялістаў. Таму такая вялікая масавасць прадметных алімпіяд: у першым туры прынялі ўдзел тры чвэрці студэнтаў СССР дзённай формы навучання. Праводзілася 39 алімпіяд па самых розных прадметах. Актыўна ўдзельнічалі ў іх і студэнты Беларусі. Толькі ў І і ІІ турах у 1984 годзе выступіла 80 тысяч савецкіх і замежных студэнтаў, што вучацца ў вышэйшых навучальных установах рэспублікі. А зараз 144 беларускія студэнты абараняюць гонар рэспублікі і сваіх ВНУ на ўсесаюзных алімпіядах.

**— Ад імя ЦК ЛКСМБ, ад імя ўсіх камсамольцаў Беларусі вітаю ўдзельнікаў алімпіяды, гасцей горада-героя Мінска, нашай рэспублікі,— гаворыць інструктар аддзела ЦК ЛКСМБ В. Грыдзюшка.— Хачу пажадаць вам навуковага пошуку, камсамольскага запалу, творчага настрою, сканцэнтраванасці. Шырокая папулярнасць алімпіяд сярод студэнтаў. Разам з павышэннем якасці падрыхтоўкі спецыялістаў такія алімпіяды дапамагаюць умацоўваць дружбу, патрыятызм, інтэрнацыяналізм, згуртоўваць студэнтаў. Таму няхай пераможуць таварыскасць, узаемаразуменне, маральнае задавальненне!**

Адкрыта алімпіяда. Прагучалі словы віншавання. А зараз — за... ЭВМ!

**— Узровень арганізацыі, бясспрэчна, узрос,— адзначае старшыня мандатнай камісіі Г. М. Букат.—Вырашана падзяліць студэнтаў і праводзіць алімпіяду універсітэтаў і эканамічных ВНУ асобна ад алімпіяды тэхнічных і сельскагаспадарчых інстытутаў. Гэта садзейнічае аднастайнасці ўдзельнікаў, павышае аб'ектыўнасць ацэнкі і патрабаванняў да іх. Ад кожнай каманды дапушчаны па 4 чалавекі: студэнты 1—3 курсаў універсітэтаў або 3—5 курсаў эканамічных ВНУ. Нам вельмі прыемна, што ў гэтым годзе прыехалі 14 каманд ад 12 саюзных рэспублік, Масквы і Ленінграда (не ўдзельнічаюць толькі прыбалтыйскія рэспублікі).**

...Каманды ў баявой гатоўнасці. Яны гатовы прайсці тры этапы, выканаць заданні па трох раздзелах і прапусціць іх праз ЭВМ. Гэта тры дні напружанай працы.

Гатовы да старту і студэнты ФПМ, якія прадстаўляюць каманду БССР. Кіраўнік — загадчык кафедры У. Л. Катκоў. У камандзе — Сяргей Запольскі (2 курс), Юлія Эйдэльман, Святлана Паснова і Віктар Аўтушка (3 курс). Яны поўныя энергіі і сіл для барацьбы за перамогу.

**— Калі я прыйшоў на ФПМ, то не ўмеў працаваць з электронна-вылічальнай машынай,— расказвае Сяргей Запольскі.— За час вучобы навучыўся быць з камп'ютэрам на «ты». Зараз надышоў час паказаць сваё уменне.**

...І пачаліся кароткія, але напружаныя будні алімпіяды: рашэнне задач у аўдыторыях і пропуск іх праз ЭВМ. А раніцай — зноў рашэнне і зноў пропуск праграмы. Усё па напружанаму графіку. У рабоце ўсе: і студэнты, і іх кіраўнікі, і члены журы, і мандатная камісія... Дастаткова сказаць, што пераможцы былі вызначаны толькі на апошнім пасяджэнні журы, якое закончылася за гадзіну да закрыцця алімпіяды. Закрыццё давялося пачаць са спазненнем. Але такая затрымка — сведчанне высокага напалу барацьбы, выдатнай падрыхтоўкі каманд і асобных студэнтаў.

Нарэшце вынікі вядомы. Прыемна, што каманда БССР, за якую выступалі студэнты ФПМ, заваявала І месца. ІІ і ІІІ месцы падзялілі каманды Масквы і Ленінграда. Ганаровае IV месца занялі навасібірскія студэнты, якія прадстаўлялі РСФСР. Такія вынікі ў камандным заліку. А лаўрэатам алімпіяды і ўладальнікам дыплома І ступені і медаля стаў Яўген Забакрыцкі, студэнт мехмата Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта імя А. Жданава. Акрамя таго, пераможца ўзнагароджаны турыстычнай пуцёўкай Бюро міжнароднага маладзёжнага турызму. Дыплом другой ступені застаўся ў Мінску — яго атрымаў Сяргей Запольскі. Трэцяе месца ў Ігара Грашчанкова, студэнта Новасібірскага універсітэта.

Алімпіяда паказала: удзельнікі выдатна падрыхтаваны. Гэта сведчыць аб паспяховай і мэтанакіраванай рабоце па выхаванню маладых спецыялістаў у сценах ВНУ нашай краіны.

А. ПАТРЭБІН, студэнт факультэта журналістыкі.

**НА ЗДЫМКУ:** пераможцы алімпіяды студэнты ФПМ нашага універсітэта Сяргей Запольскі і Святлана Паснова.

Фота А. Валошына.

# НАРАДА НАРОДНЫХ ДАЗОРНЫХ

АДБЫЎСЯ СХОД актыву органаў кантролю БДУ імя У. І. Леніна. У рабоце сходу прынялі ўдзел усе кантралюючыя арганізацыі універсітэта: камісія па кантролю за дзейнасцю адміністрацыі, партыйная камісія, «Камсамольскі пражэктар», а таксама прадстаўнікі прафсаюзнага камітэта.

З дакладам «Аб задачах органаў кантролю БДУ імя У. І. Леніна, якія вынікаюць з прамовы Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР тав. К. У. Чарненкі на Усесаюзнай нарадзе народных кантралёраў і выніках нарады» выступілі намеснік сакратара парткома універсітэта Л. А. Паўловіч і старшыня камітэта народнага кантролю А. С. Каспяровіч.

У абмеркаванні даклада прыняў удзел Л. Я. Мінько, старшыня камітэта народнага кантролю АН БССР, удзельнік Усесаюзнай нарады народных кантралёраў у Маскве.

Аб ахове сацыялістычнай маёмасці і аб праблемах, якія стаяць перад народнымі кантралёрамі, расказаў К. А. Рэвяка.

Неабходнасці больш прынцыпова падыходзіць да фарміравання саставу КНК і ГНК прысвяціла сваё выступленне Б. А. Монак, старшыня ГНК геаграфічнага факультэта.

Узаемадзеянне «Камсамольскага пражэктара» і органаў КНК універсітэта знайшло сваё адлюстраванне ў выступленні старшыні штаба «КП» А. С. Шыбута.

Работу камісіі па кантролю за дзейнасцю адміністрацыі за мінулы перыяд асвятліў М. Талочка, старшыня камісіі кантролю за дзейнасцю адміністрацыі БДУ.

Своеасаблівым падвядзеннем вынікаў работы сходу было выступленне старшыні Маскоўскага раённага камітэта народнага кантролю Л. М. Мацко, які даў агульную ацэнку работы народных дазорных універсітэта, а таксама зрабіў заўвагі і паставіў задачы па павышэнню ўзроўню дзейнасці КНК па захаванню сацыялістычнай маёмасці.

У рабоце сходу прыняў удзел загадчык няштатнага аддзела навукі, культуры і аховы здароўя КНК БССР Н. Л. Лебедзеў.

(Наш кар.).

# ФАКУЛЬТЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ: УЧОРА, СЁННЯ, ЗАЎТРА

**Тады быў жнівень суровага ваеннага 1944 года. На Захадзе ішлі цяжкія баі, а ў разбураны фашыстамі Мінск з падмаскоўнай станцыі Сходня вярнуўся універсітэт... І ў тым далёкім пякучым жніўні газеты рэспублікі на першых старонках надрукавалі пастанову ЦК ВКП(б) «Аб бліжэйшых задачах партыйных арганізацый КП(б) Беларусі ў галіне масава-палітычнай і культурна-асветніцкай работы сярод насельніцтва». Многае патрэбна было зрабіць партыйнай арганізацыі Беларусі. Сярод самых неадкладных спраў неабходна было «стварыць пры Беларускім універсітэце факультэт журналістыкі для падрыхтоўкі кваліфікаваных работнікаў друку»...**

МІНУЛА 40 ГАДОЎ. За гэты час каля трох тысяч байцоў ідэалагічнага фронту ўдасканальвалі ў сценах факультэта журналістыкі сваё прафесійнае майстэрства. Зараз выпускнікі факультэта — вядучыя работнікі друку, радыё, тэлебачання, выдавецтваў, інфармацыйных агенцтваў, вядомыя беларускія вучоныя, пісьменнікі, партыйныя і дзяржаўныя дзеячы.

Мы добра памятаем учора факультэта журналістыкі, ведаем дзень сённяшні і бачым ягоную будучыню. Гэта дае нам магчымасць зрабіць некаторае даволі цікавае параўнанне.

Сёння: на факультэце пяць спецыяльных кафедраў — гісторыі журналістыкі, тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, радыё і тэлебачання, замежнай журналістыкі і літаратуры, дзе працуе даволі вялікі калектыў таленавітых вучоных, вопытных выкладчыкаў, вядомых журналістаў. Яны перадаюць студэнтам багаты практычны вопыт, даюць глыбокія веды грамадскіх і спецыяльных прадметаў. Будучым журналістам чытаюць лекцыі, праводзяць з імі практычныя і лабараторныя заняткі 7 прафесараў і дактароў навук, 16 дацэнтаў, кандыдатаў навук, 15 старшых выкладчыкаў, выкладчыкаў і асістэнтаў. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца лекцыі прафесараў Б. В. Стральцова, М. Я. Цікоцкага, Е. Л. Бондаравай, Р. В. Булацкага, А. І. Наркевіча, І. І. Сачанкі, дацэнтаў Т. Д. Арловай, С. М. Грабчыкава, В. М. Шэіна, Л. Ф. Шылавай, А. А. Плаўнік, Н. А. Сніцаравай, С. В. Говіна, А. І. Раковіча, А. І. Цітовай, старшых выкладчыкаў А. І. Апелінскай, А. А. Рудэнка, М. Р. Каваленкі, Г. З. Бегуна, А. В. Балаша, выкладчыкаў Т. В. Здановіч, М. П. Карповіч, Л. А. Сачанка Т. М. Смольскай і іншых.

Акрамя гэтага, кожны год запрашаюцца чытаць лекцыі, праводзіць практычныя заняткі, кіраваць курсавымі і дыпломнымі работамі, весці курс «Журналісцкае майстэрства» больш як 50 вядомых журналістаў.

Учора: 50-я — 60-я гады. Студэнты факультэта журналістыкі час ад часу робяць экскурсіі на радыё, спрабуюць (вядома, у вольны час) авалодаць радыётэхнікай, а таксама фотасправай.

Сёння: на факультэце працуе кафедра тэлебачання і радыёвяшчання. У распараджэнні студэнтаў — радыё- і тэлелабараторыі, кабінет фотасправы, машынапісны кабінет, дзе яны авалодваюць майстэрствам радыё- і тэлежурналістыкі.

Учора: 50-я — 60-я гады. З друку выходзяць дзесяткі артыкулаў, зрэдку — манаграфіі, вучэбныя дапаможнікі.

Сёння: толькі за перыяд 9-й пяцігодкі выкладчыкі факультэта надрукавалі каля 200 навуковых артыкулаў, выдалі 4 вучэбныя дапаможнікі, 23 манаграфіі і зборнікі навуковых прац...

Учора: у 1978 — 1979 навучальным годзе на факультэце журналістыкі было адкрыта аддзяленне па навучанню замежных студэнтаў. І верасня да заняткаў прыступілі першыя студэнты з замежных краін.

Сёння: у 1984 — 1985 навучальным годзе на факультэце журналістыкі займаецца звыш 170 чалавек амаль з 40 краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

Можна бясконца прыводзіць факты мінулага і сённяшняга факультэта журналістыкі, і наша параўнанне будзе сведчыць аб няўхільным развіцці факультэта. Параўнанне дае магчымасць таксама заўважыць, як удасканальваецца вучэбна-выхаваўчы працэс.

Усе намаганні партыйнай і камсамольскай арганізацый, прафесарска-выкладчыцкага саставу накіраваны на тое, каб нашы выпускнікі былі сапраўднымі байцамі ідэалагічнага фронту, адданымі, паслядоўнымі змагарамі за ідэалы партыі вялікага Леніна.

Сёння шмат што радуе і турбуе калектыў факультэта. Радуе, што яго выхаванцы сталі рэдактарамі, загадчыкамі аддзелаў, карэспандэнтамі многіх газет рэспублікі, што аб іх добра адзываюцца партыйныя камітэты. З дня на дзень маладыя журналісты развіваюць набытыя ў час вучобы якасці — высокую ідэйнасць і літаратурнае майстэрства, уменне правільна арыентавацца ў шматгранным жыцці горада і вёскі. Турбуе і заклапочвае тое, што некаторыя выпускнікі марудна адаптуюцца ў рэдакцыйных калектывах — мінае часам 4—5 гадоў, пакуль яны навучацца на практыцы выкарыстоўваць тэарэтычныя веды, удумліва асвятляць складаныя праблемы эканомікі, ідэалогіі і культуры.

Пры вырашэнні праблемы творчасці журналістаў мы вылучаем некалькі аспектаў: творчая асоба, творчыя здольнасці, творчы клімат і сам працэс творчасці. І на факультэце ствараюцца ўмовы, якія садзейнічаюць таму, каб кожны студэнт кожны дзень вучыўся пісаць. Гэта — рэгулярны выпуск вучэбных газет і тэлерадыёперадач, творчыя конкурсы, круглагадавая практыка, здача творчага заліку ў канцы навучальнага года.

Турбуе і трывожыць калектыў і недасканаласць тэхнічных сродкаў навучання. Яшчэ не ўвайшлі ў студэнцкі быт лекцыі з магнітафонам і тэлевізарам, яшчэ не ўсталявалася практыка ігравых сітуацый. Яны ж лепш, чым што іншае, прывучаюць маладых журналістаў думаць над нестандартным рашэннем, выключным выпадкам, рэдкім здарэннем. Гэта важна, бо наперадзе ў журналістаў XXI стагоддзя — праблема хвіліннай аператыўнасці, найхутчэйшага асэнсавання той або іншай праблемы, новай падзеі, новага жыццёвага факта.

Нявырашаныя праблемы — нашы цяжкасці, цяжкасці нашага росту сёння.

Галоўнай задачай факультэта журналістыкі з'яўляецца падрыхтоўка кадраў для раённых, гарадскіх і шматтыражных газет.

Рашэнні чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС нацэлілі прафесарска-выкладчыцкі састаў на паскарэнне ў адпаведнасці з патрабаваннем часу перабудовы вучэбна-выхаваўчага працэсу, якая на факультэце пачалася некалькі гадоў назад.

Былі ўнесены карэктывы ў вучэбны працэс: тэматыка дыпломных і курсавых работ ахоплівае зараз асноўныя праблемы нізавога і мясцовага друку; уведзены спецкурсы і семінары, якія больш глыбока раскрываюць практыку раённых газет, прадуманы меры, накіраваныя на максімальнае збліжэнне вучэбна-выхаваўчага працэсу са штодзённым жыццём сродкаў масавай інфармацыі.

Супрацоўнікі факультэта імкнуцца даць студэнтам такі аб'ём ведаў, каб яны, прыйшоўшы ў рэдакцыю, адразу маглі ўключыцца ў творчы працэс і працаваць на поўную сілу.

40-гадовы шлях факультэта — гэта шлях непарыўных пошукаў у падрыхтоўцы кадраў для сродкаў масавай інфармацыі.

**П. ТКАЧОЎ,**
**дэкан факультэта журналістыкі.**

# «НЯХАЙ БУДЗЕ ТАК!»

40 ГАДОЎ — многа гэта ці мала? Пытанне такога парадку па сутнасці сваёй — рытарычнае, яно не мае прамога адказу. Сапраўды, хто стане сцвярджаць, што сто гадоў, дзесяць, паўгадзіны, мінута — гэта мала? Або многа?

І ўсё ж мне ўяўляецца, што адказ на пытанне ёсць. Неяк аднойчы давялося пачуць: «Год — гэта не тое, колькі мінула часу, а тое, што за гэты час зроблена». Напэўна, у гэтым ісціна.

Дык што ж адбылося на факультэце журналістыкі за сорак гадоў яго дзейнасці, калі мець на ўвазе студэнцкае навуковае таварыства?

У першыя гады СНТ факультэта журналістыкі налічвала каля трох дзесяткаў актывістаў. У канцы саракавых гадоў першыя навуковыя работы студэнтаў прадстаўляюцца на конкурсы, публікуюцца ў навуковых выданнях, становяцца тэмамі лекцый у школах і на прадпрыемствах. У гэты ж час пачалі стварацца і навуковыя студэнцкія гурткі: крытыкі, публіцыстыкі, стылістыкі...

Слаўныя традыцыі, асновы якіх заклалі студэнты 40—50-х гадоў, захоўваюцца і зараз. «Сёння» СНТ факультэта — гэта пяць яго навуковых гурткоў. У распараджэнні студэнтаў — газетны пакой, бібліятэка, тэлестудыя. Навуковыя работы выконваюць практычна ўсе студэнты факультэта. На апошняй, 41-й студэнцкай навуковай канферэнцыі — самым вялікім форуме СНТ факультэта — было прадстаўлена больш за сто дакладаў. На ёй выступалі не толькі нашы выхаванцы, але і прадстаўнікі з Палесціны, Мадагаскара, Беніна, Малі...

Толькі ў мінулым годзе на рэспубліканскі агляд-конкурс студэнцкіх навуковых работ было прадстаўлена 8 распрацовак. Тры работы («Пытанні ідэйна-маральнага выхавання вучняў сродкамі тэлебачання» Наталлі Пракапчук, «Друк рэвалюцыйных балтыйскіх маракоў у перыяд падрыхтоўкі Кастрычніцкага ўзброенага паўстання» Івана Анопкі, «Газета і жывая мова» Алены Ціхановіч) прынялі ўдзел ва Усесаюзным конкурсе і былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі.

...Гісторыя ніколі не паўтараецца. Усё цячэ, усё змяняецца. «У адну і тую ж раку нельга ўвайсці двойчы...» Стагоддзі і стагоддзі адмяжоўваюць нас ад той пары, калі вядомы мысліцель старажытнай Грэцыі Анаксагор выказаў здагадку: «Сонца большае, чым паўвостраў Пелапанес...» Наіўнае (на наш погляд) сцвярджэнне. Але ў свой час гэта было адкрыццё. Гэта нельга забываць як узор таго, на што спачатку абапіралася спрадвечная мара чалавека аб палётах да зорак.

І хай праз якіх гадоў дзесяць тая ці іншая навуковая праца, з-за якой студэнтам не спаў начэй, здасца табе наіўнай, як адкрыццё Анаксагора, але гэта будзе сведчыць толькі аб тым, што і сам ты за гэты час «вырас» з рамак сённяшняга ўяўлення. І — няхай будзе так!

**Ч. ВІКТАРАЎ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**



● ГАРЫЗОНТЫ КАФЕДРЫ ●

# ТЭОРЫІ І ПРАКТЫКІ АДЗІНСТВА

**Кафедра тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі — адна з вядучых на факультэце, які рыхтуе будучых работнікаў друку, радыё і тэлебачання. Выкладчыкі кафедры толькі за мінулую пяцігодку выпусцілі ў свет чатыры навуковыя манаграфіі, у якіх распрацоўваюцца асноўныя праблемы, што стаяць перад публіцыстамі на сучасным этапе развіцця сацыялізму ў нашай краіне. Імі падрыхтаваны сотні брашур, метадычных распрацовак, выступленняў па асобных пытаннях на старонках газет і часопісаў...**

**— Але кафедра пачынаецца не з гэтага, — удакладняе загадчык прафесар Б. В. Стральцоў, згадзіўшыся даць кароткае інтэрв'ю аб рабоце калектыву.**

— Кафедра — гэта адзінства вучэбнага, выхаваўчага і навуковага працэсу. І бадай што ў першую чаргу выхаваўчая і вучэбная дзейнасць складаюць галоўнае ў нашай працы, забірае больш за ўсё ўвагі і часу. Мяркуйце самі: курсы «Тэорыя і практыка савецкай публіцыстыкі», «Тэхніка сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды», «Уводзіны ў журналістыку», «Літаратурная і мастацкая крытыка», «Журналісцкае майстэрства», факультатыў «Гісторыя кіно», спецкурсы — усё гэта асноўныя дысцыпліны на факультэце, і ўсе яны даўно «атрымалі прапіску» ў нас. Так што студэнт, малады спецыяліст заўтрашняга дня, яго высокі прафесійны ўзровень — клопат нумар адзін кафедры...

**— Хацелася б заўважыць, што спецыяльныя вучэбныя дапаможнікі, між іншым, па вышэйназваных курсах становяцца ўсё большай рэдкасцю нават на паліцах бібліятэк...**

— Сапраўды так. Шэраг кніг і метадычных распрацовак, выдадзеных кафедрай у мінулыя гады, пакрысе становяцца пэўным дэфіцытам. Разам з тым, вучэбная літаратура ранейшых выданняў патрабуе пэўнай дапрацоўкі. Таму мы ўжо ў гэтым годзе здалі заяўкі на перавыданне самых папулярных сярод студэнтаў вучэбных дапаможнікаў.

**— Барыс Васільевіч, у сувязі з тым, што на факультэце створана аддзяленне міжнароднай журналістыкі, напэўна паявіліся пэўныя праблемы і перад вашай кафедрай!**

— Ёсць такія. І абыходзіць старанай іх нельга. Справа ў тым, што, па сутнасці, у нас яшчэ няма спецыяльнай літаратуры, падручнікаў, разлічаных на замежных студэнтаў. Гэта значна ўскладняе работу з імі. Наша кафедра ў сучасны момант здольна сваімі сіламі падрыхтаваць комплексны вучэбны дапаможнік. Работа такая ў нас вядзецца ўжо даўно, і справа, як кажуць, толькі за дазволам прыступіць да дзеяння... Ужо сёння кафедра прапануе выдавецтву для выдання наступную вучэбную літаратуру, разлічаную і на савецкіх, і на замежных студэнтаў: «Мастацка-публіцыстычныя жанры» і «Журналісцкае майстэрства» па аднайменных курсах.

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**наш кар.**

# ТАК І ПАВІННА БЫЦЬ,

## АБО ДЗЕЛЯ ЧАГО Я ВУЧУСЯ

А САПРАЎДЫ, можа не так гэта і патрэбна — траціць шмат часу, недасыпаць у сесію? І ўсё для таго, каб атрымаць яшчэ адну добрую ацэнку ці крыху вышэйшую стыпендыю?

Бывае, гэта пытанне ўзнікае само сабой. Але часцей хтосьці з аднакурснікаў ці проста знаёмых, як толькі размова заходзіць пра заняткі, абавязкова скажа гэтую фразу:

— Можа не так і патрэбна? Патрэбна. Але чаму — адказаць не так проста. Іменна маць, што ведаеш ужо шмат. Ставіць кропку. Чалавеку, каб паважаць сябе, неабходна самаўдасканальвацца.

— Іменна так ты і вучышся? Што называецца, не пакладаючы рук? Прабач, але ў гэта цяжка паверыць. З такімі філасофскімі адносінамі да заняткаў ты нічога не паспявала б.

А хіба ты не памятаеш, што сказаў аб гэтым Эдысон? Неяк яго запыталі: «Як паспець зрабіць усё?» Адказ быў нечаканы: «Перш за ўсё патрэбна зразумець, што ўсё паспець зрабіць немагчыма... І рабіць толькі самае галоўнае. Тое, на што не шкадуеш часу...»

— Калі цябе паслухаць, здаецца, што жывём мы прыкладна гадоў дзвесце, так што часу хапае.

Не, у тым і справа, што жывём адзін раз і жывём далёка не так доўга, як хацелася б. Таму і ў навуковай, і ў грамадскай рабоце імкнуся займацца тым, што мне больш блізка, да чаго «ляжыць душа», што лепш ведаю і дзе сапраўды магу праявіць сябе. І людзей хачу бачыць вакол занепакоенымі, акрылёнымі.

— А з табой... цікава. Дарэчы, на якім ты факультэце?

Журналістыкі. Але навошта гэтае пытанне? Няўжо павінна калі-небудзь адбыцца такое, што матэматык не знойдзе тэмы для размовы, напрыклад, з філолагам?

— Цяжка ўявіць, як можна адначасова апантана вывучаць і літаратуру, і матэматыку, быць у курсе літаратурных падзей і праблем эканомікі.

Не зусім так. Апантана — не самае трапнае слова. Пра матэматыку, напрыклад, мне проста расказваюць. Але справа не ў гэтым. Згадзіся, усё, што ствараецца чалавекам — прыгожа. І мая зацікаўленасць да матэматыкі, як і да літаратуры, і да жывапісу — эстэтычная.

— Такім чынам, гаворачы пра заняткі, мы ўжо дабраліся да жывапісу і літаратуры. Усё ж не магу паверыць, што вось так, займаючыся, па тваіх словах, тым, што падабаецца, можна вучыцца выдатна. Ты ж вучышся выдатна.

таму, што вучуся якраз не дзеля таго, аб чым ты гаворыш. Не дзеля выдатных адзнак і вялікай стыпендыі.

— Так-так, зараз пачнеш гаварыць аб тым, што вучышся дзеля ведаў.

Не, гэта можа здацца парадаксальным, але вучыцца «дзеля ведаў» немагчыма. Хіба ж стане табе лепш ад разумення таго, што сотня-другая бітаў (гэта ад матэматыкаў) лягла табе ў галаву?

— Бітаў... З вамі, выдатнікамі, нават размаўляць цяжка. І ўсё ж дзеля чаго?

Ведаеш, відаць, проста дзеля ўласнага задавальнення. Я не лічу, што ахвярую нечым, накіроўваючыся суботнім вечарам у бібліятэку, а ў чытальнай зале я не проста «атрымліваю веды» — я з радасцю адчуваю, як людзі, якія далёка, і тыя, каго ўжо даўно няма, дзеляцца са мною сваімі знаходкамі, адкрыццямі.

— Мне ўжо здалося, што для цябе гэта «бібліятэчная паэзія» больш прывабная, чым усе нашы, простых студэнтаў, радасці?

Навошта ж такія супрацьпастаўленні. Проста нельга ду-

Так, але ж гэта не асноўная мэта. Мне здаецца, зусім не цяжка адолець нашы, не такія ўжо і неабсяжныя праграмы. Проста існуе радасць атрымання ведаў, як у навуцы. Быў такі славуты філосаф — Спіноза. Ён гаварыў, што атрымліваць грошы за заняткі навукай амаральна. Гэта значыць, што такая праца — сама па сабе ўзнагарода. Я лічу, што гэта іменна так. І нічога не раблю дзеля таго, каб выдатна вучыцца. Гэта ж цудоўна: цэлых пяць гадоў на тое і толькі на тое, каб пазнаёміцца з маленькай часткай усяго прыгожага, што створана чалавецтвам.

— Гм... Цікава... Ну, бывай... Сама разумееш, час...

Вось так магла б скончыцца гэтая размова, калі б яна раптам адбылася. Хаця чаму «калі б»? Яна адбываецца і адбывалася. У кожнага. А вучыцца выдатна — гэта сапраўды цікава. Паспрабуй...

А пакуль. Мяне чакаюць каля бібліятэкі...

**Т. БЯЛЬКЕВІЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

● НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ●



НА ФАКУЛЬТЭЦЕ журналістыкі адбылася навукова-практычная канферэнцыя «Журналістыка: гістарычны вопыт, сучасная практыка, майстэрства». На пленарным пасяджэнні заслуханы тры даклады. Аб праблемах удасканалення падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў у святле рашэнняў чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС і пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні дзейнасці раённых і гарадскіх газет» расказаў дэкан факультэта журналістыкі прафесар П. І. Ткачоў. Асаблівасцям функцыяніравання Беларускага радыё ў сістэме сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды прысвяціў сваё выступленне дацэнт Я. Р. Радкевіч. Загадчык рэдакцыі грамадска-палітычнай інфармацыі БЕЛТА У. В. Шарпіла прааналізаваў мясцовы друк як арганізатара сацыялістычнага спаборніцтва ў сучасных умовах.

На канферэнцыі працавалі секцыі: гісторыі журналістыкі; тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі; тэлебачання і радыёвяшчання; літаратурнай работы ў газетах, на тэлебачанні і радыё; раённых і гарадскіх газет у сістэме СМІП; міжнароднай журналістыкі. Усяго заслухана звыш 50 дакладаў і паведамленняў. Канферэнцыя прайшла на высокім арганізацыйным і навукова-метадычным узроўні. Выпрацаваны канкрэтныя практычныя рэкамендацыі. Лепшыя тэзісы дакладаў будуць надрукаваны.

**НА ЗДЫМКАХ: у час работы навукова-практычнай канферэнцыі.**

Фота і тэкст **В. Караля.**

# ІМКНЁМСЯ БЫЦЬ ЖУРНАЛІСТАМІ

Я АДЗІН з тых нешматлікіх аманскіх студэнтаў, якім пашчасціла вучыцца ў Савецкім Саюзе. Некаторыя з нас выбралі прафесію журналіста. Гэта не выпадкова. Аман, як і многія краіны, што развіваюцца, мае патрэбу ў спецыялістах гэтай галіны.

Перад нашым прагрэсіўным друкам стаяць вялікія задачы.

У Савецкім Саюзе на факультэтах журналістыкі ёсць усе магчымасці не толькі для вывучэння тэарэтычных курсаў, але і для падмацавання тэорыі практычнымі навыкамі. На нашым факультэце таксама пастаянна ўдасканальваюцца метады навучання. Тут мы можам набыць мноства неабходных ведаў, атрымаць шмат карысных парад, таму што выкладчыкі і савецкія журналісты, мы гэта ведаем, заўсёды дапамогуць нам, падзеляцца вопытам.

Акрамя таго, мы ўдзельнічаем у рабоце розных гурткоў, знаёмімся з метадамі работы савецкіх журналістаў, з дзейнасцю выдавецтваў і рэдакцый газет, творчымі саюзамі. Я, напрыклад, з'яўляюся членам аднаго з самых цікавых гурткоў на факультэце — гуртка публіцыстыкі. Думаю, што гэта дапаможа мне ў маёй будучай рабоце.

**СУХЕЛЬ САЛЕМ СААД.**
**студэнт факультэта журналістыкі**




# КАРОТКІ ШЛЯХ да Караткевіча

ЧОРНЫ замак Альшанскі. Што стаіць за векавой гісторыяй, што хоча сказаць ён людзям?

Безумоўна, аўтары тэлефільма «Чорны замак Альшанскі» (рэжысёр М. Пташук) думалі над гэтымі пытаннямі, ствараючы яго па аднайменнаму раману Уладзіміра Караткевіча. Зварот кінематаграфістаў да рамана «Чорны замак Альшанскі» не выпадковы. Героі гэтага твора вабяць нас псіхалагізмам, аналітычным складам розуму, імкненнем усвядоміць свет і сваё месца ў ім.

Галоўны герой рамана—Косміч. Мы сочым за яго самааналізам, і прыцягваюць нас у гэтым герої перш за ўсё логіка, ход думак, а затым ужо непасрэдна дзеянні—паездка ў Альшаны, расследаванне таямнічых гісторый.

Ідэя рамана мне ўяўляецца ў адказнасці людзей за захаванне чалавечага ў чалавеку, у вечнасці гуманістычных ідэалаў і духоўных каштоўнасцей. Гэтая думка пераклікаецца з усім, што адбываецца ў рамане. Бунтар Валюжыніч і яго каханая Ганна-Гардзіслава Альшанская, аддадзеныя мужам Гардзіславы князем Альшанскім на лютыя мукі, перад смерцю заклінаюць:

— Мы сустрэнемся. Мы вечныя. Няма мяжы шэсцю нашаму па зямлі.

І праз вякі нашчадкі іх Сташка і Антон Косміч адказваюць:

— Яны ўсё ж дачакаліся. Жывыя ўсе ж дакліkaліся іх.

На жаль, кінематаграфісты пакінулі многае за кадрам. Так і не адчулі гледачы заклік пісьменніка:

— Што ад мяне застанецца? Кругаварот рэчыва ў прыродзе? Ну, хіба так. Але ніхто не пазнае мяне ні ў травіне на згладжаным капцы, ні ў чырвонай залонцы кляновага ліста, што спадае на схіл гары.

У фільме аддаецца перавага фабуле рамана, падзеі яшчэ больш абвастраюцца—часам да патурання непатрабавальнасці некаторых гледачоў. І нічога тут не мяняюць апраўданні рэжысёра М. Пташука, што, маўляў, фільм створаны па матывах рамана і не прэтэндуе на поўны яго ахоп. Шкада, што стваральнікі фільма не скіравалі сваю ўвагу на раскрыццё філасофскай думкі раманіста. Банальная тайна захавання каштоўнасцей, напластаванне на яе вострага апавядання аб дзеяннях фашысцкіх малойчыкаў ведамства Розенберга—гэта далёка не «Чорны замак Альшанскі». Косміч у кнізе праходзіць складаны шлях пазнання важнейшых пытанняў быцця. Усведамленне такіх агульначалавечых паняццяў, як адданасць Радзіме, подзвіг, прыводзіць да разумення: чалавек жыве высокім, напоўненым жыццём, калі карані яго—на роднай зямлі, калі ён—нашчадак тых герояў, якія змагаліся за Радзіму, якія не здрадзілі роднаму. Шкалой вымярэння чалавечнасці ў Караткевіча становіцца мяжа, па адзін бок якой—адданасць Радзіме, па другі—здрадніцтва. Мы пільна сочым, у які бок ступілі героі, на якую ступень узняліся, і той рамантычны ідэал, які ўяўляе сабой найвышэйшае ўзвышэнне асобы на роднай зямлі, на роднай аснове, зачароўвае нас. Узмацненнем гэтай думкі служыць вобраз апошняга Альшанскага. Ён, чалавек неардынарны, таксама імкнецца да вышыні, але аснова яго—маленькі пятачок родавага герба. Занадта маленькая пляцоўка для ўзлёту. Яна і вядзе Лыганоўскага-Альшанскага да краху. Праблема подзвігу і здрадніцтва хвалюе Караткевіча не сама па сабе, а як тая рыса, якая ўзвышае Ганну-Гардзіславу і Валюжыніча над Вітаўтам Альшанскім, а Косміча і Сташку—над Лыганоўскім-Альшанскім. Гэтая рыса падводзіцца канчаткова ў эпізодзе, калі героі апынуліся ў каменным мяху. У гэтым эпізодзе—выпрабаванне нашых сучаснікаў на чалавечую годнасць, на права стаць у адзін рад з людзьмі легенды. Услед за Валюжынічам Косміч праз вякі паўтарае:

— Мы выйдзем, мы выйдзем адсюль, Ганна-Гардзіслава, мы выйдзем адсюль, Сташка...

Гэта выйсце не толькі з каменных мяхоў. Гэта выйсце з адавых кругоў зла, што спляліся з сівой даўніны і зусім нядаўняй вайны з яе «санітарнымі акцыямі».

Твор Караткевіча цікавы трапяткімі адносінамі да здабыткаў нацыянальнай культуры. Прыгажосць і рамантычнасць беларускіх легенд і песень, займальнасць гістарычных экскурсаў у глыбіню вякоў—усяго гэтага, на жаль, пазбаўлены глядач. Фільму не стае стройнасці і лагічнасці, якія ў першаснове вызначаюць лінію Косміча. Вобразам Косміча вымяраюцца малыя і вялікія праяўленні чалавечнасці. Тое лепшае, што атрымалася ў фільме, толькі адцяняе аднапланавасць рэжысёрскіх рашэнняў.

Было б пабольш адухоўленасці—філасофскі сэнс кніжных старонак адкрыўся б гледачу без падмены яго прасталінейнай гісторыяй традыцыйных чорных замкаў.

**Н. РАМАНАВА,**
студэнтка
факультэта журналістыкі.

**Виктор КУКЛОВ**

**ПРОВОДНИК**

Седина. Морщин ряды.
Хитроватый взгляд.
Шрам по центру бороды.
Шутками богат.
Чай. Постели. Стук колес.
Тихая молва.
Знали б, что он перенес:
Шутка ли — война!

Скажет кто-то невзначай:
Что ж ты нынче, дед,
Не в награду ль носишь чай
Вдоль купе чуть свет?»
Он ответит без идей,
В руки взяв мундштук:
«Просто я люблю людей
И колесный стук...»



**Светлана ДЮБАЙЛО**

*В дома входить, где стекол ледяши,*
*Вновь сеять ветер в этот мир огромный.*
*И сил своих последние гроши*
*Переплавлять на колокол недремный.*

*Чтоб слева на груди звезда зажглась,*
*Пробив лучами пыльную одежду,*
*Чтоб жизни стебелек не втаптывался в грязь,*
*Чтоб верили в тебя и ждали как надежду.*

*Сечет под корень ржа, но кто-то должен встать,*
*Есть песни влага на охрипших связках.*
*Есть долг, ты должен в номер жизни сдать*
*Всего себя под типографской краской.*



**Валянцін ЖДАНКО**

Нарэшце я з сабой на сам.
Спакой халодны і гаючы.
Балюча
Сціснутым рукам.
І скроням студеным
Балюча.
Нарэшце

За дажджу сцяной,
Як за сцяной неразумення,
Усёдараванне і натхненне
Прыйшлі ў кут забыты мой.

Адсюль вярнуся я
Або,
Як час апошні мне настане,
Пайду
Без права на вяртанне,
Затое
З правам на любоў.

# ЧАКАЕМ СПЕЛЫХ КАЛАСОЎ

ЖУРФАК з году ў год засявае палеткі самымі буйнымі і адсартаванымі зярнятамі, чакае дружнай руні, гадуе важкія каласы. Сяўбе спрыяе негустое сіта творчага конкурсу, што праводзіцца перад уступнымі экзаменамі.

Шмат было важкіх, спелых каласоў у кожным дзесяцігоддзі факультэта. То паэтаў, то празаікаў, то выдатных журналістаў называем мы цяпер. Не збочыў факультэт з гэтай добрай традыцыі-дарогі і на чацвёртым дзесятку сваёй гісторыі. І шырэйшыя абсягі займае пад новы ўраджай, і клопат пільнейшы як у дэканата, так і ў Саюза журналістаў у выхаванні творчай моладзі. Традыцыйным стаў конкурс «Залатое пяро», у якім вызначаюцца лепшыя публіцыстычныя творы студэнтаў, паэтычнае слова мацнее дзякуючы факультэцкай «Руні», у якой аб'ядноўваюцца тыя, хто спробы пяра хоча ўдасканаліць, кожны свой радок аддаючы сябрам на абмеркаванне — на крытычную ацэнку вартасцей і хібаў, якіх сам часам не заўважаеш. Студэнты-журналісты павінны добра пісаць усе. Гэта іх прафесійны абавязак. Але і тут знойдуцца правафланговыя, у каго слова нібы само выходзіць з-пад пяра, становіцца ўзорам для іншых.

«Залатое пяро» помніць сваіх першых пераможцаў — Аляксандра Уліцёнка, Таццяну Мушынскую, Дзмітрыя Новікава, Сяргея Новікава, Васіля Рошчына, Галіну Сачанка, Аляксандра Класкоўскага. Яны, ідучы ў вялікую журналістыку, не толькі займалі прызавыя месцы ў конкурсе. Кафедрам і кіраўніцтву факультэта важна было конкурсныя «баталіі» зрабіць асновай для творчай вучобы ўсяго студэнцкага калектыву, вучобы сістэматычнай і прафесійнай. Нашы пераможцы — сёння частыя госці на факультэце: расказваюць, як вучыліся, дзеляцца вопытам нялёгкай журналісцкай працы. Перад студэнтам, якога яшчэ палохаюць газетныя справы, такія сустрэчы адкрываюць новыя гарызонты ў авалоданні сваёй прафесіяй.

Студэнты, не толькі журфакаўцы, трымаюць у сакрэце свае мары пра літаратурны Парнас. Не так хутка ён пакажа вам невялічкі сшытак, у якім зроблены першыя крокі ў паэзію. Такога студэнта трэба знайсці, далучыць да грамады, інакш творы яго застануцца нікім не прачытанымі, астыне паэтычная душа. Не было яшчэ нашай літаратурнай «Руні», а Леанід Пранчак падахвоціўся збіраць журфакаўскія таленты, каб пераканаць усіх, што факультэт даваў і можа даць прыкметнае папаўненне пісьменніцкаму фронту.

Ніхто, можа, і не думаў пра папаўненне. Проста былі сустрэчы, былі дыскусіі па творах сваіх сяброў. Запрашаліся пісьменнікі, ва ўласным доме смялей выступалі пачаткоўцы, закраналі складаныя пытанні творчага майстэрства. Студэнцкая аўдыторыя станавілася асабліва люднай, калі ў госці прыходзілі Янка Брыль, Васіль Быкаў, Янка Сіпакоў, Генадзь Бураўкін, Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі. І ўсё ж такі папаўненне ёсць. Нядаўнія выпускнікі факультэта Уладзімір Рубанаў, Уладзімір Саламаха, Віктар Супрунчук выдалі па добрай кніжцы апавяданняў і аповесцей, праз нейкі час будуць мець зборнікі вершаў Алесь Цвях і Алесь Усеня. А быў час, пачаткоўцы шукалі кансультантаў, і як радаваліся іх сэрцы, калі рукапіс трапляў у клапатлівыя рукі выкладчыкаў ці пісьменнікаў (таксама выкладчыкаў), што працуюць на факультэце. Трэба было падумаць пра сістэматычную творчую вучобу, пра авалоданне законамі паэтыкі, пра пастаянную дапамогу.

З лёгкай рукі Васіля Зуёнка ў нас сталі наладжвацца творчыя сустрэчы, сустрэчы не для ўсяго факультэта, а толькі для «Руні». Між іншым, «Рунь» і пачала сваю гісторыю з памятнага пасяджэння, на якім Васіль Зуёнак прапанаваў мець такі факультэцкі гурток. Ён гаварыў пра сябе, з надзеяй глядзеў на нас. У зборніку вершаў «Нача» і сёння «рунеўцы» з хваляваннем чытаюць кароткі паэтаў аўтограф як праграму на заўтрашні дзень: «Літаратурнай «Руні» факультэта журналістыкі — рунець і наліваць важкі колас». Было гэта ў 1978 годзе. Лавілі тады кожнае слова паэта Алесь Цвях, Алесь Усеня, Аляксандр Васількевіч, Барыс Яўсейчык, Аляксандр Дашчынскі. Аматары паэзіі наладжвалі вечары, прысвечаныя юбілейным датам. Добра адсвяткаваў факультэт 100-годдзе з дня нараджэння Аляксандра Блока, юбілей народных песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Блокаўскаму вечару Дашчынскі, наш шаноўны Сан Саныч, аддаў увесь свой арганізатарскі і артыстычны талент. Пасяджэнні «Руні» Барыс Яўсейчык праводзіў у паэтычна восеньскім ці вясновым афармленні. Пры такой аздобе і вершы з душою чыталіся, і працавалася весялей.

Сэрцам закаханыя ў паэзію, не ўсе, на жаль, здружваюцца з паэтычным пяром на ўсё жыццё. Але творчая вучоба на факультэце, рунеўскія вёсны і зімы пакідалі прыкметныя сляды, натхнялі сэрцы паэтаў. Ці ж не ганарыцца пачатковец, калі выходзіць пераможцам у конкурсе «Залатое пяро», ці ж не гонар яму і факультэцкая слава, калі ён едзе на творчую сустрэчу ў Кіеўскі універсітэт (у нас з ім даўняя дружба), ці ж не зайздросцілі сябры Валянціну Жданко, калі ён трапіў на творчы семінар маладых у Каралішчавічы? Згадзіцеся, такія падзеі — сустрэчы, творчыя справаздачы, выхад у вялікі паэтычны свет — былі і будуць жыццядайным зарадам бадзёрасці і натхнення для ўсяго факультэта. «Руні» пасля ёсць што абмяркоўваць, ёсць што прапанаваць для літаратурнай старонкі «Беларускага універсітэта». І ёсць над чым задумацца крытыкам.

Не маю намеру гаварыць сёння пра якасць нашай творчасці. Нехта доўга затрымліваецца на школьным узроўні, нехта паглыбляецца ў матывы «смутку і журбы», а іншы разважае: да прозы ці паэзіі ён больш здатны.

Крэплі і зрываліся галасы ў Наталлі Бабко, Таццяны Гасціловіч, Святланы Раманавай, Алёны Сазановіч... Зусім па-сталаму загаварылі Уладзімір Сяменчык, Валянцін Жданко, Віктар Бабей, тоўстыя сшыткі заняў добрай публіцыстычнай прозай Уладзімір Міхно. Клопатаў у «рунеўцаў» шмат: яны рупяцца паехаць у падшэфны калгас, выступаюць на рэспубліканскім радыё і тэлебачанні. З выкананнем «заказаў» на выступленне ці паездку паспяхова спраўляецца Ігар Ганчарук.

Ажыўлена і па-баявому праходзяць сустрэчы-дыспуты па праблемах сучаснай паэзіі. З якой сур'ёзнасцю і дасведчанасцю, з выяўленнем сваёй грамадзянскай пазіцыі выступаюць Віктар Чарняўскі, Вадзім Грамовіч, Міхась Талочка! Нашы крытыкі і наша крытыка не раз выводзілі з тупіка і пачаткоўца, і таго, хто мае багаты «рунеўскі» стаж. Аналіз паэтычнага радка, руху наперад спадабаўся, памятаю, Яўгеніі Янішчыц і Вользе Іпатавай, якія пабывалі ў нас у гасцях. Гэтыя сустрэчы нагадвалі творчыя семінары, што вядуць вопытныя мастакі слова ў Маскоўскім літаратурным інстытуце імя А. М. Горкага. Такую вучобу з поспехам прадоўжаць і журналісты і пісьменнікі, калі мы будзем мець пастаянны клопат аб творчай моладзі на факультэце.

Асабліва важна своечасова сустрэцца з першакурснікамі. Першая творчая праца выяўляе таленты. Напісаны лірычныя замалёўкі, апавяданні, проста школьныя сачыненні. І вершы. Вершаў шмат. Значыць, будзе папаўненне ў «Руні», будуць творчыя спрэчкі, будуць хвалюючыя паэтычныя імгненні. «Рунь» чакае прыліву свежых сіл. Будзе папаўненне — будзе больш радаснага клопату.

**М. КАВАЛЕНКА,**
**старшы выкладчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, кіраўнік літаб'яднання «Рунь».**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

6 снежня 1984 г.

Зак. 1975. АТ 10576

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ